Н43
БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 27 сакавіка 2009 года, № 5 (1998)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## КОСМАС ВАБІЦЬ БДУ!

***Рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Сяргей Абламейка прыняў удзел у працы XI з'езда Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў (ЕАУ).***



*С. Абламейка з рэктарам ЕНУ Б. Абраімавым*

Форум адбыўся 10 сакавіка ў сталіцы Казахстана Астане і быў прысвечаны 20-годдзю асацыяцыі, адным з сузаснавальнікаў якой з'яўляецца БДУ. ЕАУ аб'ядноўвае 98 універсітэтаў з краін СНД, а таксама Латвіі. Пасля з'езда асацыяцыя папоўнілася 13 новымі членамі, сярод якіх Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт, Санкт-Пецярбургскі дзяржуніверсітэт эканомікі і фінансаў, Ціхаакіянскі універсітэт і шэраг украінскіх ВНУ.

Сяргей Абламейка выступіў на з'ездзе з дакладам пра навуковыя і адукацыйныя працэсы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, прыняў удзел у працы Савета ЕАУ, правёў перамовы з калегамі з іншых ВНУ.

У рамках візіту рэктар БДУ падпісаў дамову аб супрацоўніцтве з Еўразійскім нацыянальным універсітэтам імя Льва Гумілёва. Мэта – павышэнне якасці вышэйшай адукацыі, умацаванне ўсебаковых сувязяў паміж універсітэтамі, а таксама актыўная інтэграцыя двух ВНУ ў сусветную адукацыйную і навуковую прастору.

***Акрамя таго, кіраўнікі вядучых ВНУ Беларусі і Расіі Сяргей Абламейка і Віктар Садоўнічы падпісалі Мемарандум па ўзаемадзеянні і супрацоўніцтве паміж БДУ і МДУ імя М. Ламаносава ў галіне касмічнай адукацыі і навукі.***

Бакі запланавалі пачаць працу па стварэнні сумеснага універсітэцкага навукова-адукацыйнага мікраспадарожніка. Галоўныя выканаўцы праекта – НДІ ядзернай фізікі МДУ і Цэнтр аэракасмічнай адукацыі БДУ. ЦАА зоймецца распрацоўкай апаратуры і стварэннем цэнтра кіравання, прыёмам і апрацоўкай дадзеных навуковай і службовай тэлеметрыі. Таксама ў праекце будуць задзейнічаныя нашы фізічны факультэт (распрацоўка і выраб бартавога вылічальнага комплексу), НДІ ядзерных праблем (распрацоўка дэтэктараў касмічных промняў), НДІ прыкладных фізічных праблем (распрацоўка спектраметрычнай апаратуры для вывучэння аптычных характарыстык атмасферы Зямлі), факультэт радыёфізікі і электронікі (распрацоўка апаратуры і правядзенне іанасферных радыёфізічных даследаванняў).

Нароўні з гэтым БДУ возьме ўдзел у бягучых навукова-адукацыйных праектах МДУ "Таццяна-2" і "Радыёскаф". Запуск гэтых мікраспадарожнікаў адбудзецца гэтым летам.

Сур'ёзнасць намераў партнёрскіх ВНУ пацвярджае той факт, што ўжо 13 сакавіка Белдзяржуніверсітэт наведала працоўная група расійскага федэральнага касмічнага агенцтва "Раскосмас" на чале з прадстаўніком УНДІ электрамеханікі імя А. Іасіф'яна і галоўным канструктарам "Таццяны-2" Ігарам Кажэўнікавым. Апошні зрабіў падрабязны даклад пра касмічныя праграмы УНДІ, у тым ліку пра праграмы навукова-адукацыйных мікраспадарожнікаў. Быў вызначаны план дзеянняў па распрацоўцы канцэпцыі сумеснага універсітэцкага мікраспадарожніка, а таксама абмеркаваныя характарыстыкі будучага мікраспадарожніка БДУ.



*Сяргей Абламейка і Віктар Садоўнічы*

Па словах Сяргея Абламейкі, дадзены апарат мусіць спрыяць развіццю навуковых тэхналогій і ўдасканаленню падрыхтоўкі студэнтаў, а таксама міжнароднаму іміджу Белдзяржуніверсітэта. Казаць пра тэрмін яго запуску пакуль цяжка, бо ўсё ўпіраецца ў фінансавае пытанне.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

### СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ ТРЭБА ІДЭНТЫФІКАВАЦЬ**
Інтэрв'ю з начальнікам упраўлення перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы Генадзем ДЫЛЯНАМ
**Стар. 2**

**КААПЕРАЦЫЯ ПА ШВЕДСКІМ УЗОРЫ**
Пра візіт Ганаровага дырэктара праграмы "Балтыйскі універсітэт" прафесара Ларса РЫДЭНА
**Стар. 3**

**БЕНЕФІС ТВОРЧАСЦІ І АЗАРТУ**
VIII Фестываль эстрады БДУ запаліў новыя "зорачкі"
**Стар. 4**

### ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

30 сакавіка ў будынку рэктарата на Бабруйскай, 5а адбудзецца пасяджэнне Вучонага савета БДУ. Прагучаць даклады дэкана геаграфічнага факультэта Івана Пірожніка аб выкананні дзяржпраграмы "Прыродакарыстанне" за перыяд 2006–2008 гг., а таксама прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава пра вынікі Праграмы перспектыўнага развіцця "Развіццё формаў і метадаў уключэння студэнцтва ў арганізацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу". Пачатак у 10.15.

ВЫСТАВЫ

## СКАЗ ПРА ЗБРОЮ

***Выстава "Гісторыя ратнай славы", прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, дэманстравалася з 24 па 26 сакавіка ў будынку рэктарата БДУ.***



На ёй былі прадстаўлены экспанаты з фондаў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. На ўрачыстым адкрыцці выступілі рэктар БДУ прафесар Сяргей Абламейка і дырэктар музея Сяргей Вечар.

Можна было ўбачыць халодную і агнястрэльную зброю XIX– пачатку XX стст., рэдкія мундзіры XVIII–XIX стст., ваенныя фракі, паўкафтаны, тунікі, грэнадзёркі, ківеры, фуражкі, будзёнаўкі, афіцэрскія шалікі, генеральскія і маршальскія паясы Савецкай Арміі. Пра ўсе экспанаты займальна распавядаў гід. Наведвальнікам дазвалялася нават прымерыць гістарычны ваенны ўбор і сфатаграфаваць гэты момант.

Ініцыятар выставы – пярвічная прафсаюзная арганізацыя работнікаў Белдзяржуніверсітэта.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

КАНТАКТЫ

## ЗАКІД НА ЕЎРОПУ

***Вельмі прадуктыўна правёў свой адпачынак у Славакіі кіраўнік БДУ Сяргей Абламейка. У пачатку сакавіка ён падпісаў дамову аб супрацоўніцтве з рэктарам Універсітэта горада Жыліна Янам Буйняком.***

Універсітэт г. Жыліна – сучасная еўрапейская ВНУ з шырокай міжнароднай дзейнасцю. У ёй культывуюцца пераважна інжынерныя, эканамічныя і кіраўнічыя спецыяльнасці. У структуры 7 факультэтаў і 4 інстытуты. Навучаецца там каля 15 тыс. студэнтаў.

Дамова разлічана на пяць гадоў. Яна прадугледжвае абмен навучэнцамі, запрашэнне выкладчыкаў для чытання лекцый і правядзення навучальных заняткаў, абмен навучальна-метадычнай і навуковай літаратурай, правядзенне сумесных семінараў і канферэнцый, супрацоўніцтва ў рамках Балонскага працэсу ды інш.

Ужо з восені гэтага года, да прыкладу, некаторыя аспіранты ФПМІ БДУ змогуць займацца навуковымі даследаваннямі пад кіраўніцтвам славацкіх навукоўцаў.

Акрамя таго, дасягнутая дамоўленасць пра падрыхтоўку двух міжнародных праектаў. Першы падаецца ў 7-ю Рамачную праграму і накіраваны на супрацоўніцтва ў сферы выкарыстання інфармацыйных тэхналогій па ранняй дыягностыцы раку лёгкіх, а таксама стварэння неабходнага для гэтага абсталявання. Апроч ВНУ-партнёраў у ім удзельнічае шэраг беларускіх і еўрапейскіх арганізацый, кааперацыя з якімі здзяйснялася раней. Другі праект плануецца ў межах праграмы TEMPUS IV, арыентаванай на развіццё IT у сферы вышэйшай адукацыі. Галоўным рэалізатарам тут выступае факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, маючы на ўвазе набліжэнне навучальнага працэсу ў альма-матэр да агульнаеўрапейскіх стандартаў.

Падчас наведвання універсітэта Сяргей Абламейка выступіў таксама з навуковым дакладам на факультэце інфарматыкі славацкага універсітэта.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ЗАГАДАМ рэктара БДУ ад 4 сакавіка бягучага года прарэктарам па эканоміцы і інвестыцыях прызначаны Уладзімір Панарадаў. Дагэтуль ён займаў пасаду намесніка прарэктара.

ШКОЛА студэнцкага актыву Студгарадка праходзіць з 27 па 29 сакавіка ў САК "Брыганціна". Удзел у ёй прымаюць міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў і рэктар Белдзяржуніверсітэта Сяргей Абламейка.

РЭКТАР БДУ Сяргей Абламейка сустрэўся 18 сакавіка на сваёй малой радзіме ў г. п. Воранава Гродзенскай вобласці з мясцовымі школьнікамі ў Дзень выпускніка. Ён распавёў будучым абітурыентам пра наш універсітэт і пра спецыяльнасці факультэтаў.

РАБОЧАЯ група па ўкараненні ў БДУ сістэмы электроннага дакументазвароту "Электронная справа" створана загадам рэктара ад 25 сакавіка пад кіраўніцтвам прарэктара па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях Паўла Мандрыка.

ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТ Германскай акадэмічнай службы абменаў Макс Хубер і кіраўнік Інфармацыйнага бюро DAAD у Мінску Міхаэль Клеес наведалі БДУ 26 сакавіка. На сустрэчы з рэктарам нашага універсітэта Сяргеем Абламейкам былі абмеркаваныя новыя формы двухбаковага супрацоўніцтва.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ТУРНІР З АДНЫМ НЕВЯДОМЫМ

***Прадстаўнікі альма-матэр сталі пераможцамі Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды ў камандным і індывідуальным заліках.***

У індывідуальным заліку 1 месца заняў Аляксандр Лабаты (БДУ), 2 месца падзялілі Васіліна Марчук (Юрыдычны каледж БДУ) і Ганна Дзмітрачкова (БДУ), 3 месца дасталася Анастасіі Калько (БДУ).

У камандным заліку 1 месца ў калектыву “Just cause” (БДУ), 2 месца – у каманды “Прававы аспект” (БДУ) і толькі “бронза” ў “Фартуны” (Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь) і “Lynces justae” (Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Францыска Скарыны).

У алімпіядзе змагаліся 11 камандаў з 9 ВНУ краіны і 53 удзельнікі ў індывідуальным заліку. Пасля першага дня спаборніцтваў у фінале па змагаліся 8 камандаў і 22 “індывідуалісты”.

Алімпіяда праходзіла 20–21 сакавіка на юрыдычным факультэце БДУ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі. Удзельнікам трэба было паказаць свае веды па наступных галінах: тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; канстытуцыйнае і адміністрацыйнае права, грамадзянскае права і працэс, гаспадарчае права і працэс; крымінальнае права і крымінальны працэс; экалагічнае і зямельнае права. Сярод заданняў – распрацоўка праекта правапрымяняльнага акта, правядзенне экспертызы нарматыўнага акта, праца з электроннымі базамі дадзеных, выступленне ў судзе і судовых спрэчках.



*Аляксандр Лабаты*


*Каманда “Just cause”*

Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда праводзіцца з 2005 г. З 2007 г. мае статус рэспубліканскай.

**Марыя ЖАРЫЛОЎСКАЯ**

КОНКУРСЫ

# ПА НОВЫХ ЛЯКАЛАХ

**У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Палажэння аб парадку прысуджэння прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі, зацверджаным Вучоным саветам БДУ 5 сакавіка 2009 г., у рамках штогадовага конкурсу імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі аб'яўляецца конкурс для маладых навукоўцаў (дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатаў навук – да 35 гадоў, даследчыкаў без ступені – да 30 гадоў).**

Прэмія маладым навукоўцам усталёўваецца ў памеры 50 базавых велічынь.

Штогод маладым навукоўцам таксама будзе прысуджацца па адной прэміі ў кожнай галіне.

Удзел у конкурсе адбываецца на агульных падставах.

Адпаведная інфармацыя публікавалася ў № 3 газеты “Універсітэт” ад 24 лютага 2009 г.

Падрабязныя звесткі пра конкурс можна атрымаць у аддзеле суправаджэння і кантролю НДР (т. 209-51-62). Электронныя варыянты дакументаў размешчаны на серверы БДУ (Microsoft Outlook) *“Агульныя папкі” / “Усе агульныя папкі” / “Галоўнае ўпраўленне навукі” / “Конкурс А. Н. Сеўчанкі і У. І. Пічэты”*.

**Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# “ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ ТРЭБА ІДЭНТЫФІКАВАЦЬ”

## Генадзь ДЫЛЯН:



***Сістэма менеджменту якасці адукацыі (СМЯ), пра якую наша газета пісала ў нумары ад 23 студзеня, знаходзіцца ў стадыі актыўнай распрацоўкі. У дадзены момант вялікая група спецыялістаў універсітэта рыхтуе дакументы, якія вызначаюць асноўныя палажэнні і патрабаванні да арганізацыі адпаведных узаемазвязаных працэсаў.***

***Мы папрасілі растлумачыць сутнасць таго, што адбываецца, аднаго з распрацоўшчыкаў сістэмы, начальніка ўпраўлення перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы Генадзя ДЫЛЯНА.***

***Якія задачы, на Ваш погляд, прынцыпова вырашыць на пачатковым этапе гэтага маштабнага праекта?***

Сама наяўнасць сістэмы кіравання якасцю з'яўляецца найважнейшай передумовай дасягнення якасці. Натуральна, гэтая сістэма павінна быць сертыфікавана ва ўстаноўленым парадку і павінна адпавядаць усталяваным патрабаванням. Замінаюць дадзенаму працэсу цяжкасці панятквага характару. Перш за ўсё неабходна прыйсці да адзінства ў разуменні сутнасці паняцця “якасць” у дачыненні да вышэйшай адукацыі. Проста ацаніць якасць прадуктаў харчавання, бытавых прыбораў, кампутара, аўтамабіля і нават надвор'я, бо для гэтых прыкладаў ёсць пэўныя крытэрыі і колькасныя вымяральнікі якасці. У адукацыі ж сітуацыя значна складанейшая. На мой погляд, тут трэба вырашыць некалькі паслядоўных задач:

*1. Канкрэтызацыя паняцця “якасць вышэйшай адукацыі”.*

Якасць – інтэгральная (комплексная) характарыстыка, шматмернае паняцце, якое ахоплівае асноўныя віды дзейнасці універсітэта, яго функцыі і вынікі гэтай дзейнасці;

Якасць мае дачыненне і да універсітэта, і да навучэнцаў;

Ацэначным характарыстыкам якасці вышэйшай адукацыі падлягаюць наяўныя ўмовы, рэсурсы, працэсы і вынікі навучання;

Паняцце “якасць адукацыі” мае непасрэдную сувязь з усталяванымі патрабаваннямі, нормамі.

*2. Усталяванне пераліку патрабаванняў да якасці, якія маюць канкрэтнае (там, дзе гэта магчыма) колькаснае выражэнне.*

Асновай з'яўляюцца дзейныя адукацыйныя стандарты, патрабаванні да акрэдытацыі, атэстацыі, пацверджання статусу вядучай ВНУ. У значнай ступені наяўныя патрабаванні да якасці вузаўскай адукацыі не прадугледжваюць магчымасцяў яе вымярэння. А якасць з любым выпадку можна вызначыць, толькі вымераўшы яе альбо параўнаўшы з эталонам. Іншых шляхоў не існуе. З гэтай прычыны і прынцыповае пытанне пра колькасныя параметры. Адсутнасць поўнага складу адзіных патрабаванняў да якасці ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі выклікае неабходнасць распрацаваць і усталяваць уласныя. Такія патрабаванні могуць быць зафіксаваныя ў адпаведных стандартах універсітэта.

*3. Распрацоўка крытэрыяў і паказчыкаў ацэнкі якасці, укараненне адпаведнага механізму яе ацэнкі.*

Любая сістэма кіравання якасцю прадугледжвае наяўнасць крытэрыяў і паказчыкаў яе ацэнкі. Асновай для іх вызначэння з'яўляюцца патрабаванні да якасці.

Пад крытэрыем ацэнкі якасці разумеецца катэгорыя, якая служыць для змястоўнай ацэнкі любога параметра, які складае паняцце якасці адукацыі. Паказчык ацэнкі якасці – колькаснае выражэнне канкрэтнага крытэрыю.

Напрыклад, ступень кампутарызацыі навучальнага працэсу з'яўляецца крытэрыем ацэнкі, а колькасць студэнтаў на адзін кампутар для вучобы – паказчыкам ацэнкі. Наяўнасць падобных паказчыкаў у сваёй сукупнасці распачынае стварэнне механізму ацэнкі якасці універсітэцкай адукацыі.

***Адзін з канчатковых вынікаў адукацыйнай дзейнасці ВНУ – прадстаўленне паслуг на рынку працы. Гэты рынак арыентуецца не толькі на колькасць спецыялістаў, але і на якасць іх падрыхтоўкі. Якія тут існуюць тэндэнцыі, запыты?***

У ракурсе прадстаўлення адукацыйных паслуг якасць універсітэцкай адукацыі можна разглядаць як комплексную характарыстыку, якая мае тры ўзроўні:

– *базавая якасць* – сукупнасць тых паказчыкаў, наяўнасць якіх спажывец лічыць абавязковай, успрымаючы іх як належнае;

– *патрабаваная якасць* – сукупнасць паказчыкаў, якія ўяўляюць сабою функцыянальныя характарыстыкі паслугі, якія адпавядаюць неабходным крытэрыям, што прад'яўляюцца спажыўцамі;

– *жаданая якасць* – сукупнасць паказчыкаў якасці дадатковых адукацыйных паслуг звыш усталяваных абавязковых патрабаванняў.

Відавочна, што ўжо сёння на рынку адукацыйных паслуг больш запатрабаваныя спецыялісты, падрыхтаваныя на ўзроўні патрабаванай і жаданай якасці. Пэўную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў такога ўзроўню, у прыватнасці, наканавана выконваць магістратуры.

***Метадычныя ўказанні арыентуюць распрацоўшчыкаў СМЯ на выкарыстанне міжнародных стандартаў ІСО. Наколькі яны могуць быць адаптаваныя да нашых умоў?***

Выкарыстанне стандартаў ІСО звязана з неабходнасцю сертыфікацыі сістэмы кіравання якасцю адукацыі БДУ і ў перспектыве з міжнародным прызнаннем універсітэцкага дыплома. Стандарты ІСО (ISO) Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі спрыяюць развіццю агульнай адукацыйнай прасторы, і ў гэтым заключаецца іх прызначэнне і значнасць.

Разам з тым, сапраўды, шэраг палажэнняў гэтых стандартаў не адрозніваецца канкрэтнасцю і прадстаўлены як нейкія намеры, дэкларацыі. У любым выпадку, тое, пра што гаворка ішла вышэй, у згаданых стандартах практычна не праглядаецца. У нашым разуменні стандарт – абавязковыя патрабаванні, выкананне якіх забяспечвае атрыманне якасці ўсталяванага ўзроўню.

***Відавочна, што якасць адукацыі залежыць ад мноства фактараў. Якія з іх, на Ваш погляд, вызначальныя?***

У абагульненым варыянце якасць падрыхтоўкі спецыялістаў вызначаюць:

– прынцыпы і сістэма кіравання, мэты і змест адукацыі;

– формы, тэхналогіі, спосабы (метады, прыёмы) і сродкі навучання;

– навучальна-матэрыяльнае забеспячэнне (планы, праграмы, падручнікі, дапаможнікі, навучальна-метадычныя комплексы);

– сістэмнасць давузаўскай падрыхтоўкі патэнцыйных абітурыентаў, узровень патрабаванняў пры паступленні ў ВНУ;

– узровень унутраных патрабаванняў да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў;

– знешнія фактары (культурна-сацыяльнае, нарматыўна-прававое асяроддзе, рынак адукацыйных паслуг, рынак працы, канкурэнты, партнёры);

– арганізацыя кантролю засваення ведаў і фарміравання ўменняў навучэнцаў;

– ацэнка якасці рэсурсаў (наяўнага патэнцыялу), уваходных і выходных дадзеных (вынікаў) для кожнага з асноўных відаў дзейнасці універсітэта.

Прыведзенае падкрэслівае шматграннасць і складанасць згаданай праблемы. Варта адзначыць, што ў сістэме кіравання якасцю, якая ствараецца ў БДУ, будуць задзейнічаныя кіраўнікі і спецыялісты усіх падраздзяленняў універсітэта, а таксама студэнты. Толькі агульнымі намаганнямі мы даб'ёмся жаданага прагрэсу.

***Што ж у агульных рысах будзе ўяўляць сабою сістэма менеджменту якасці ў нашым універсітэце і якая будзе яе рэальная аддача ў найбліжэйшай перспектыве?***

Паняцце “сістэма” прадугледжвае адзінства мэт, зместу, кіраўнічых дзеянняў, узаемасувязь усіх кампанентаў, арыентацыю на пэўны вынік. Важна, што сама праблема якасці актуалізуецца. На пачатковым этапе важна зразумець і ацаніць наяўны ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэта дасць магчымасць канкрэтызаваць задачы і дзеянні як на агульнауніверсітэцкім узроўні, так і на кожным факультэце, на кожнай кафедры. Вынік новага падыходу адчуе на сабе кожны спецыяліст, а праз яго і працадаўца. А ад гэтага рэнамэ нашай ВНУ вырасце яшчэ больш.

**Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**



*Сістэма менеджменту якасці – мудрагелістая справа нават для спецыялістаў*

УНІВЕРСІТЭТ

## СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

# КААПЕРАЦЫЯ ПА ШВЕДСКІМ УЗОРЫ

***Навукова-практычны семінар "Прагрма "Балтыйскі універсітэт" у БДУ: рэальнасць і перспектывы" прайшоў 16 сакавіка па ініцыятыве хімічнага факультэта.***

Галоўным госцем мерапрыемства стаў Ганаровы дырэктар і заснавальнік вядомай у Еўропе экалагічнай праграмы Ларс Рыдэн, які сустрэўся з выкладчыкамі і студэнтамі хімфака, геафака, ФФСН, ФМА і іншымі зацікаўленымі. Прафесар Упсальскага універсітэта (Швецыя) не ўпершыню прыехаў у Беларусь. Па яго словах, яму было вельмі цікава бліжэй пазнаёміцца з нашай краінай. Беларусь – адзін з самых актыўных удзельнікаў праекта. Семінар насіў не толькі навуковы, але і азнаямляльны характар для многіх з прысутных. Выступіў прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце Віктар Самахвал, які ў 2006 г. на міжнароднай канферэнцыі кіраўнікоў ВНУ ў Швецыі і падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве паміж БДУ і універсітэтам г. Упсала. Сярод удзельнікаў быў Сяргей Дарожка, дырэктар Нацыянальнага цэнтра праграмы "Балтыйскі універсітэт" у Беларусі, які знаходзіцца ў БНТУ. Студэнты і выкладчыкі вышэйзгаданых факультэтаў падзяліліся ўласным вопытам і сваімі ўражаннямі. У сваю чаргу, Ларс Рыдэн падрабязна распавёў пра стварэнне "Балтыйскага універсітэта" і перспектывы праекта.

### Вытокі

"Балтыйскі універсітэт" – міжнародная праграма для студэнтаў, магістрантаў і выкладчыкаў гуманітарных спецыяльнасцяў, якая ахоплівае 200 ВНУ з 14 краін рэгіёну Балтыйскага мора. Мэта праекта – аб'яднаць універсітэты рэгіёну для супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, сацыяльнага і экалагічнага развіцця, для вырашэння сумесных праблем. Шведскі універсітэт г. Упсала распрацаваў багата вучэбных курсаў: "Народы Балтыкі", "Устойлівае развіццё Балтыйскага рэгіёну", "Балтыйскі рэгіён: культура, палітыка, грамадства", "Чыстая вытворчасць". Многія падручнікі ўжо перакладзены на рускую мову, але ў БДУ не шукаюць простых шляхоў да навукі. Нашы "хімікі" і "міжнароднікі" займаюцца па-англійску. У вучэбным працэсе выкарыстоўваюцца такія сучасныя методыкі, як сумесныя он-лайн праекты і навучанне з дапамогай відэаматэрыялаў. Пасля заканчэння курса студэнты здаюць экзамен праз



*Ларс Рыдэн сярод студэнтаў і выкладчыкаў хімічнага факультэта і ФФСН*

інтэрнэт. Пасля паспяховага выпрабавання маладыя людзі атрымліваюць дыпломы міжнароднага ўзору. Пры паступленні ў еўрапейскія ВНУ яны даюць пэўную колькасць "крэдытаў" – дадатковых балаў.

### На сёння

У нашай краіне праект рэалізуюць 29 айчынных навучальных устаноў. Мясцовым каардынатарам з'яўляецца згаданы Нацыянальны цэнтр, праз які калісь Белдзяржуніверсітэт і даведаўся пра існаванне праекта. Першым да "Балтыйскага універсітэта" далучыўся геаграфічны факультэт і ФФСН, а потым ФМА і хімічны факультэт. Колькасць навучэнцаў, якія цікавяцца праграмай, з кожным годам расце. У 2006 г. на хімфаку займаліся толькі 9 чалавек (усе атрымалі дыпломы) – сёлета ўжо 14 студэнтаў і 7 магістрантаў. Асаблівасцю заняткаў на хімфаку з'яўляецца тое, што яны адбываюцца ў вольны час студэнтаў. На ФМА яны ўключаны ў вучэбны расклад, і ў гэтым годзе курс праходзілі 28 чалавек, з іх 20 атрымалі дыпломы. Многія з тых, хто паспяхова здаў тэсты і праявіў зацікаўленасць, летам бралі ўдзел у міжнародных семінарах і канферэнцыях. Напрыклад, студэнты хімічнага факультэта з'ездзілі ў Лодзь (Польшча) на канферэнцыю, прысвечаную кліматычным зменам і праблеме міжкультурных камунікацый. Удзельнічалі прадстаўнікі БДУ таксама ў летняй экалагічнай школе на парусніку "Фрэдэрык Шапэн", дзе студэнты з розных краін засвойвалі матэрыял і абменьваліся вопытам падчас вандроўкі па маршруце "Германія – Нарвегія – Данія – Швецыя – Польшча".

### Зазірнём у будучыню

Шведскі прафесар правёў у Беларусі цэлы тыдзень. Ларс Рыдэн сустрэўся з кіраўніцтвам БДУ, прачытаў лекцыі на хімічным факультэце па тэме чыстай вытворчасці, а на ФМА – па ўстойлівым развіцці, прадставіў беларускім удзельнікам новыя вучэбныя матэрыялы і выказаў жаданне яшчэ больш інтэнсіўна развіваць праграму ў нашай краіне з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. На яго прапанове ў кастрычніку гэтага года кіраўніцтва альма-матэр прыме ўдзел у канферэнцыі рэктараў універсітэтаў-удзельнікаў праграмы "Балтыйскі універсітэт", якая адбудзецца ў Польшчы.

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, фізікі, экалогіі чалавека, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дыферэнцыяльных ураўненняў, функцыянальнага аналізу, філасофіі культуры, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, псіхалогіі, рускай літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, энергафізікі, фізікі паўправаднікоў і наназлектронікі, біяфізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, фізіялогіі чалавека і жывёл, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, генетыкі, малекулярнай біялогіі, фізіялогіі і біяхіміі раслін, заалогіі, гісторыі Расіі, экалогіі чалавека, крыніцазнаўства, банкаўскай і фінансавай эканомікі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, філасофіі і метадалогіі навукі, псіхалогіі, сацыяльнай камунікацыі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, міжнародных адносін, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, сучаснай беларускай мовы, гісторыі беларускай мовы, беларускай літаратуры і культуры, англійскага мовазнаўства, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, замежнай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, рускай мовы, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, тэарэтычнай фізікі, біяхіміі, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, экалогіі чалавека, крыніцазнаўства, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, нямецкай мовы, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, замежнай літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры, класічнай філалогіі, прыкладной лінгвістыкі, рускай літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, англійскага мовазнаўства, беларускай літаратуры і культуры, нямецкага мовазнаўства, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, філасофіі і метадалогіі навукі, германскіх моў, замежнай літаратуры, прыкладной лінгвістыкі, фізічнага выхавання і спорту;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяхіміі, лазернай фізікі і спектраскапіі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# КУБАК СПЛАВІЛІ СТАЛЯВАРАМ

**Адказаць на 40 пытанняў давялося ўдзельнікам першага чэмпіянату гістарычнага факультэта па "Што? Дзе? Калі?" сярод студэнтаў.**

Пераможцам чэмпіянату і ўладальнікам адмысловага кубка стала хлапечая каманда "Сталявары з Пітсбурга", якая здолела даць 29 правільных адказаў. Усяго ў турніры, што адбыўся 16 сакавіка, прынялі ўдзел 12 студэнцкіх калектываў. Каманды "Жвірбліс" і "Праднейшая-Рада", якія адказалі на 25 пытанняў, падзялілі 2–3-яе месца.

Студэнтам адводзілася хвіліна на кожнае заданне, большая частка якіх была звязана са спортам. На дзіва, "непад'ёмнымі" сталі пытанні па гісторыі факультэта. Як прызналіся самі інтэлектуалы, "не трэба было капаць, трэба было ведаць". Мала хто ведаў, што першая археалагічная практыка студэнтаў факультэта, арганізаваная ў 1939 г., адбылася ў Херсанэсе. Смешную блытаніну выклікала пытанне пра канферэнцыю, зладжаную ў красавіку 1979 г. Гульцы павінны былі здагадацца, якой падзеі яна была прысвечана. Большасць меркавала, што 45-годдзю гістфака. А насамрэч – 109-й гадавіне з дня нараджэння У. Леніна.

Гэты інтэлектуальны турнір распачынае шэраг мерапрыемстваў да 75-годдзя гістарычнага факультэта, якое святкуецца сёлета. Арганізатары спадзяюцца, што розыгрыш кубка па "ШДК" стане адной з традыцый факультэта і ў будучым перарасце ў адкрыты чэмпіянат.

Павел МАХІНАЎ

# ВАКАНСІЙ СТАЛА МЕНШ

***На геаграфічным факультэце 4 сакавіка прайшоў традыцыйны "Кірмаш вакансій".***

Яму папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа. Кожная з 8 кафедраў факультэта разаслала профільным прадпрыемствам запрашэнні да ўдзелу. На жаль, на гэты раз адгукнуліся толькі 5 працадаўцаў, што значна меней, чым летась, калі да географаў завіталі прадстаўнікі 12 рэспубліканскіх прадпрыемстваў. Вынік эканамічных цяжкасцяў! Найбольш запатрабаванымі сёлета аказаліся выпускнікі спецыяльнасці "Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў".

На факультэце заўсёды ўскладваюць вялікія спадзяванні на кірмаш вакансій, які праводзіцца тут ужо трэці год. 24 сакавіка на папярэдняе размеркаванне выпускнікоў таксама прыходзілі патэнцыйныя працадаўцы. Па словах метадыста Лііліі Харытонавай, хоць у поле зроку прадпрыемстваў на гэты раз трапіла значна меней студэнтаў, пэўны плён кірмаш усё-такі прынёс. Студэнты пазнаёміліся з новымі структурамі, некаторыя заключылі папярэднія дамоўленасці аб супрацоўніцтве, а гэта месца не толькі працы будучых выпускнікоў, але і арганізацыі вытворчых практык.

Ганна ЛАГУН

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Пяць падзей вачыма рэктара БДУ Сяргея Абламейкі – "Советская Белоруссия" (14.03).

**Мемарандум пра намеры па ўзаемадзеянні і супрацоўніцтве паміж БДУ і МДУ імя Ламаносава ў сферы касмічнай адукацыі і навукі** – БелТА, БелаПАН (13.03); "Звязда" ("Белдзяржуніверсітэт замахнуўся на космас!", 18.03).

**Дагавор аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Еўразійскім нацыянальным універсітэтам падпісаны рэктарам БДУ ў Астане падчас працы XI з'езда Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў** – "Советская Белоруссия" (10.03).

**Дамова аб супрацоўніцтве паміж БДУ і універсітэтам славацкага горада Жыліна** – БелТА (05.03); "Советская Белоруссия" (06.03); "Рэспубліка" ("Одним другом больше", 10.03).

**Дырэктар абсерваторыі БДУ Альгерд Кузнечык каментуе надыход астранамічнай вясны** – "Советская Белоруссия" (20.03).

**Жыццё студэнтаў падчас фінансавага крызісу на прыкладзе студэнтак БДУ** – "Чырвоная змена"/ "Звязда" ("Уладкуйся на працу і жыві спакойна", 20.03).

**Рэспубліканская юрыдычная алімпіяда сярод студэнтаў на базе юрыдычнага факультэта** – БелТА (19.03, 23.03).

**Спаборніцтвы беларускіх школьнікаў на базе БДУ ў рамках Міжнароднага матэматычнага турніру гарадоў** – БелТА (17.03).

**Фарміраванне студатрадаў БДУ** – БелТА (14.03); БелаПАН, tut.by (15.03).

**Перамога студэнтак БДУ ў міжнародным турніры па парламенцкіх дэбатах** – БелТА (09.03); "Днепровская неделя" ("Студенты спорят о большой политике", 11.03).

**Перамога каманды ліцэя БДУ на Рэспубліканскім турніры юных фізікаў** – "Настаўніцкая газета" ("Перамагла ручная фізіка", 12.03).

**Вынікі Рэспубліканскай універсіяды па лыжных гонках, дзе каманда БДУ заваявала некалькі прызавых месцаў**, – "Настаўніцкая газета" (12.03).

**Першыя заняткі на курсах "Хрысціянскія каштоўнасці ў кантэксце сучаснасці" ў Інстытуце журналістыкі БДУ** – "Вечерний Минск" ("Привлекли христианские ценности", 12.03).

**Да 80-годдзя доктара філалагічных навук прафесара БДУ Аркадзя Наркевіча** – "Народная газета" ("Жыццё, прысвечанае слову", 10.03); "Настаўніцкая газета" ("Слова ў кантэксце часу", 14.03).

**Выстава мастака Юрыя Макарава ў рэктараце БДУ** – "Настаўніцкая газета" ("Бэзавы подых вясны", 07.03).

**Біячып для галаўнога мозга, распрацаваны вучонымі фізічнага факультэта БДУ і Інстытутам фізіялогіі НАН РБ** – "Советская Белоруссия" ("Клетка подает голос", 06.03).

**Інтэрв'ю з найлепшай футбалісткай 2008 года, удзельніцай жаночай футбольнай каманды "Зорка БДУ" Таццянай Кіесе** – "Вечерний Минск" ("Татьяна Киосе: "Идеальное 8 марта – бутсы и миллион алых роз", 06.03).

**Канцэрт курсантаў ваеннага факультэта БДУ на юрыдычным факультэце Белдзяржуніверсітэта, прысвечаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны**, – "Во славу Родины" ("Подарок для ветеранов", 05.03).

**Конкурс "Зорная пара" Студэнцкага гарадка БДУ** – "Минский курьер" ("Звезды ходят парами", 05.03).

**Пра кошт навучання ў БДУ** – telegraf.by (05.03).

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

**У мінулым годзе выдавецтвам БДУ падрыхтавана да друку 438 арыгінал-макетаў вучэбных, даведачных і навуковых выданняў, а пабачыла свет 355 кніг і брашур агульным аб'ёмам 2398,45 улікова-выдавецкага аркуша. З пачатку 2009 года выдадзена 39 кніг аб'ёмам 418,36 улікова-выдавецкага аркуша.**

*Журавков, М. А.* **Фундаментальные решения теории упругости и некоторые их применения в геомеханике, механике грунтов и оснований.**

У курсе лекцый змяшчаюцца класічныя і новыя матэрыялы па розных аспектах пабудовы фундаментальных рашэнняў тэорыі пругкасці і алгарытмаў іх колькаснай рэалізацыі, іх выкарыстання пры рашэнні задач механікі дэфармаваных цвёрдых цел, у прыватнасці, задач геамеханікі, а таксама механікі грунтаў і асноў.

*Белакурская, Ж. Я., Радзевіч, А. А.* **Сучасная беларуская мова.**



У вучэбна-метадычным комплексе змешчаны планы лекцый, практычныя заданні па фанетыцы, фаналогіі, арфаэпіі, графіцы, арфаграфіі, лексікалогіі, фразеалогіі, марфалогіі і сінтаксісе сучаснай беларускай мовы. Пададзены варыянты кантролю самастойнай работы студэнтаў, а таксама даведачны матэрыял да іх.

*Попова, Е. Э.* **Основы информатики и информационные технологии.**

Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае рабочую праграму, канспект лекцый, вучэбна-метадычныя ўказанні для правядзення лабараторных работ, заданні для самастойнай работы студэнтаў і кантролю ведаў, уменняў і навыкаў, тэрміналагічны слоўнік і табліцы асноўных дзеянняў падчас работы з аперацыйнай сістэмай Windows і тэкставым працэсарам MS Word.

*Калацкая, Л. В.* **Компьютерный анализ и синтез изображений.**



У курсе лекцый прыведзены прыклады выкарыстання сістэм машыннага бачання, прадстаўлена агульная характарыстыка каляровых выяў, асаблівасці захавання і апрацоўкі відэададзеных, алгарытмы сегментацыі і аналізу аб'ектаў выяў. Разглядаюцца нейрасеткавыя тэхналогіі і мадэлі недакладнай логікі, скіраваныя на распазнаванне аб'ектаў выяў і стварэнне звышхуткасных прыстасаванняў паралельнай апрацоўкі інфармацыі.

### 30 красавіка
### СЛЭМ – БІТВА ПАЭТАЎ

Запрашаем студэнтаў, паэтаў, аматараў паэзіі ўзяць удзел у паэтычным слэме "Бітва паэтаў".

Падчас "Бітвы" істотна не толькі прадставіць на суд журы яркія вершы, але і эмацыйна выконваць свае творы на сцэне.

Журы разгледзіць не больш як 2 творы ад кожнага ўдзельніка і адбярэ 20 фіналістаў з 50 першых дасланых заяў.

Творы можна дасылаць сюды: ga.poetryslam@gmail.com

альбо прыносіць у рэдакцыю газеты БДУ "Універсітэт" (Бабруйская-7, каб. 411) ці ў Прадзюсарскі клуб Інстытута сучасных ведаў "M&A Project group" (Філімонава-69, кафедра культуралогіі, каб. 428) **да 15 красавіка.**

*Месца дзеяння: кавярня "Яблык" (Карастаянава-32).*

*Цікавосткі:* вольны мікрафон, відэаінсталяцыя, усім удзельнікам фіналу – яблычны пунш.

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# БЕНЕФІС ТВОРЧАСЦІ І АЗАРТУ

***На небасхіле альма-матэр іскрыста заззялі новыя "зорачкі", яркія і неверагодна каларытныя! Закружылі нас у чароўных танцах, заваражылі песнямі, прывабілі вершамі.***

Гаворка пра VIII Фестываль эстрады БДУ, што кожны год збірае адораных хлопцаў і дзяўчат, якія знаходзяць, чым уразіць і здзівіць.

Але ж, як вядома, шлях да зорак ляжыць праз церні. На двух адборачных турах удзельнікам прыйшлося даказваць свае творчыя здольнасці. Пры гэтым не ўсе ўспрымалі гэта як спаборніцтва.



**Іван Помаз, ФМА:** "Адчуваю дух барацьбы. Вельмі хачу перамагчы, бо шмат часу рыхтаваўся".

**Мікіта Найдзёнаў, журфак:** "Хвалююся зараз, бо ў зале сядзіць дзяўчына, якой вельмі хачу спадабацца".

**Алег Стульба, фізфак:** "Прыйшоў, каб людзі пачулі добрую класічную музыку і атрымалі ад гэтага асалоду. Хутчэй бы на сцэну!"

12 сакавіка адбыўся грандыёзны гала-канцэрт, права выступіць на якім заслужылі найлепшыя. І, бадай, кожны з 37 артыстычных нумароў выклікаў шквал апладысментаў у якасці прызнання таленту выступоўцаў.

Урэшце, дыпломамі лаўрэатаў конкурсу ганараваны ў намінацыі *"Размоўны жанр"* Аляксандр Новікаў (ММФ), Ганна Дашук (геафак); *"Музыка"* – Уладзімір Развадоўскі (геафак), Антон Гліністы (фізфак), Алег Стульба (фізфак); у намінацыі *"Танец"* – Ірына Волкава (ІБМТ) і Дыяна Гайваронская (гумфак), а таксама танцавальны калектыў "JD" (геафак); *"Песня"* – Вольга Майсяёнак (ФМА), Дзмітрый Макарчук (Ліцэй БДУ), Ігар Міклашэвіч (гістфак); *"Песня "Hip-hop"* – Дэвід (ФРіЭ), Яўген Бараноўскі (ваенфак); *"Арыгінальны жанр"* – цыркавы калектыў "Белая Русь" (юрфак), Алена Удот і Паліна Чыбірай (фізфак), Марына Мартыненка і Вольга Клёцкіна (гістфак).

Таленавітыя людзі вельмі эмацыянальныя і камунікабельныя, таму нават пасля заканчэння мерапрыемства за кулісамі менш народу не стала. Наадварот, адусюль чуліся спевы, вясёлыя гутаркі і раскацістыя смех. Фестываль эстрады яшчэ і добры спосаб пазнаёміцца і знайсці сяброў. Канкурсанты разам фатаграфаваліся, абменьваліся кантактамі, абмяркоўвалі далейшыя творчыя планы.

**Ігар Міклашэвіч, гістфак:** "Вельмі рады поспеху! Збіраюся ўдзельнічаць усюды, дзе толькі магчыма, каб "расці" ў творчым плане".

**Анастасія Шульгава, геафак:** "Не чакала, што пераможам. Усё добра, толькі ногі баляць – вельмі хацелася спадабацца гледачам і журы".

**Вольга Майсяёнак, ФМА:** "Вельмі прыемна адчуваць сябе пераможцам! Хачу зрабіць новы творчы нумар, спалучыўшы яго з лацінаамерыканскімі танцамі".

Можна сцвярджаць, што Фестываль эстрады знайшоў і свайго ўдзельніка, і гледача, стаў адной з найлепшых традыцый БДУ, добрым спосабам для кожнага заявіць пра сябе і свой факультэт.

Што ж, абавязкова сустрэнемся ў наступным годзе!!!

**Лілія БОНДАР**

## МАЙСТРОЎНЯ

# МАСЛЕНІЦА Ў МІЖКУЛЬТУРНЫМ ВІРЫ

***Выкладчыкі і студэнты-старшакурснікі кафедры сучасных замежных моў ФМА 24 лютага разам святкавалі Масленіцу, натуральна, у лінгва-культуралагічным фармаце.***

На адзін дзень звычайная студэнцкая аўдыторыя на Маякоўцыператварылася ў рознакаляровы кірмаш талентаў – па калідорах шпацыравалі лісяняты і ваўчаняты, карлсаны і арыстакраты, пацаны з раёна і вясковыя красуні. "З якой казкі яны пазбягалі?!" – думалася непраінфармаваным выкладчыкам і студэнтам. Тым часам мы, удзельнікі, з яшчэ большым запалам разыгрывалі свае ролі: "Excuse me, Sir, would you be so kind as to show me the way to the Vioska, please?" – "Unsere Koloboken sind die besten Koloboken in der Welt!" – "Га-колобкім шэляну товім вэ мэаньенім!"...

Не, студэнты СЗМ не паз'язджалі з глузду! Гэта старажытная і паўсюдная традыцыя – падчас Масленіцы ладзіць карнавал з пераўвасабленнем у розныя міфічныя стварэнні ды ўвогуле праяўляць сябе як мага больш творча і нечакана. Карані свята ляжаць у далёкім мінулым, калі ўсё рабілі адным кагалам – разам збіралі ўраджай, разам спраўлялі вяселле. Яшчэ ў паганстве нашы продкі ладзілі напрадвесні вялізарныя вогнішчы ў гонар бога ўрадлівасці, пяклі ахвярны хлеб – бліны, спявалі, вадзілі карагоды, спальвалі саламянае пудзіла, каталіся на санях ды конях. Усё гэта звалася гуканнем вясны. З распаўсюджваннем хрысціянства старажытныя звычаі перапляліся з новымі традыцыямі, і з часам усталявалася свята са смачнай назвай – Масленіца. Дарэчы, гэта адзінае паганскае свята, якое было ўзаконена Царквой – у якасці ўрачыстай трапезы (якая доўжыцца цэлы тыдзень) перад Вялікім постам. Адсюль пайшла і назва – Масленіца, Маслены тыдзень, па асноўным кампаненце святочнага стала. Цікава, што дні спраўлення Масленіцы не супадаюць на захадзе і на ўсходзе Еўропы. Справа ў канфесійных адрозненнях: у каталікоў пост пачынаецца з Попельнай серады, якой папярэднічае Карнавальны аўторак – гэтак званы Pancake Day (англійская), Faschingsdienstag (нямецкая); у праваслаўных – з панядзелка пасля Дараванай нядзелі. Вось на гэты апошні дзень перад Чатырохдзесятніцай (шасцю тыднямі посту перад Вялікаднем) і прыпадаюць найвесялейшыя народныя гулянні. На англійскай мове Масленіцу клічуць Shrovetide, Carnival ці нават Pancake Week (што люструе сувязь паміж традыцыямі); у нямецкай – der Fasching, або die Fastnachtswoche. У іншых мовах таксама можна знайсці словы з блізкай этымалогіяй.

Такім чынам мы і вырашылі зладзіць дзень кафедры падчас Масленага тыдня – каб захапіць па часе традыцыі ўсіх краін, мовы якіх мы вывучаем. Вядома, ідэя свята з'явілася не з паветра – нашы добрасумленныя выкладчыкі штогод збіраюць творчых студэнтаў і арганізуюць з імі вечарыны з розных нагод – ад Каляд да Дня незалежнасці Германіі. Атрымліваюцца гэткія культурніцкія міжсабойчыкі, дзе кожны можа паказаць, на што ён здольны – тым больш, што ўсе студэнты СЗМ валодаюць некалькімі мовамі: беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, іўрытам, лацінскай і старажытнагрэчаскай. Гэтым разам мы пераўзышлі саміх сябе: хто спяваў, хто маляваў, хто ставіў вадэвілі; рабілі кампутарныя прэзентацыі і аматарскае кіно, культуралагічныя віктарыны і вясёлыя эстафеты; і, канешне, елі шмат смачных начыненых бліноў, дарэчы, спечаных сваімі рукамі. Арганізатары імпрэзы – выкладчыцы кафедры Александрына Зеляноўская, Іна Мецечка, Святлана Трафіменка і Святлана Рудая – засталіся задаволеныя нашым добрым настроем, сяброўскай атмасферай і арыгінальнасцю. Праўда, рыхтаваліся мы як сапраўдныя студэнты: усё ў апошнія дні, затое крэатыўна і з гумарам. Кожная група трымала свае каронныя нумары ў сакрэце. Хтосьці спешна клеіў калажы, хтосьці пісаў прамовы, потым разам абмяркоўвалі, жартавалі, прапаноўвалі мноства неверагодных варыянтаў. Такая праца яднае як ніякая іншая.

І вось доўгачаканы дзень надышоў. Адзін носіцца з блінамі, другі наладкоўвае тэхніку, а іншы проста швэндаецца туды-сюды з фотакамерай і фіксуе ўсіх сваіх надзвычай экстравагантна апранутых аднакурснікаў. Карнавальныя касцюмы, бадай, і сталі "разыначкай" свята (кемлівыя арганізатары загадзя пастанавілі ўваход толькі ў адпаведным строі, ды і самі не парушылі правіла). Ідэя з пераапрананнем адразу прыйшлася ўсім даспадобы. Аляксандра Ліпніцкая паспела выступіць у ролі і цудоўнай спявачкі, і вяскоўвага дзеда-веселуна: "Мне вельмі цікава пераўвасабляцца – тым больш калі мяняеш пол і ўзрост; намагаешся зрабіць гэта з гумарам і падараваць радасць іншым. Гэтая вечарына – магчымаць паглядзець на сябе з іншага боку, адшукаць недзе ў душы нечаканыя для самога сябе ноткі". Калі нарэшце ўсе расселіся, хоць давялося і нямала пацiснуцца, на "сцэну" выйшлі вядучыя. Яна – беларуская цыганка (Алена Дубавая), ён – шатландзец у абавязковым кілце (Арцём Федарчук). Разам яны растлумачылі ўсім "па панятках" – на розных мовах (хто ж тут ведае, каму на якой зручней?), што зараз адбываецца ў прыемнай жартоўнай форме. У сярэдзіне мерапрыемства эстафету пераняў старэйшы курс – ізноў казачныя персанажы Лісічка й Мышаня (Алена Чэклу і Валерыя Шавяка), якія прыгожа і цікава распавядалі нам на нямецкай (хоць мы, трэцякурснікі, і не ўсё здолелі зразумець). А ў выніку свята атрымалася, як гаворыцца,"о-ёй-ёй, тэбэ люблю я". "Сёння я адчуў сябе ў сваёй талерцы, адчуў неверагодны прыліў сіл! Я ўбачыў, што людзі не адмовіліся ад дзяцінства. А найбольш за ўсё спадабалася фагамахія бліноў напрыканцы", – дзеліцца ўражаннямі Юра Паўлаў, які, між іншым, атрымаў прыз глядацкіх сімпатый за касцюм уайльдаўскага дэндзі, а таксама за фільм пра жыццё нашай альма-матэр, зроблены ў супрацоўніцтве з прадстаўніком нямецкай фірмы па вытворчасці Калабкоў "Volkskolobwagen" Аленай Кудзько. Дарэчы, паглядзець на нас завітала нямала гасцей – ад студэнтаў з іншых курсаў да загадчыкаў розных кафедраў – усім вельмі спадабалася, абяцалі заўсёды падтрымліваць такія творчыя ініцыятывы.

Відавочна, старыя добрыя "капуснікі" студэнту ўсё ж такі неабходныя. І зусім не для кавачкі, а для сябе. Бо сучасная тэндэнцыя да набыцця вузкай спецыяльнасці, нібыта дастатковай у жыцці, – няправільная. Бо так цудоўна даць волю таямнічым парывам душы.

**Хрысціна ШВЕДА**




*Пераможцы конкурсу разам з вядучымі імпрэзы*

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

27 сакавіка 2009 года
Падпісана да друку 25.03.2009 г.
Зак. 329. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, каб. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by